# Рэалізацыя сумеснага праекта Белпошты і Беларусбанка па прадастаўленні банкаўскіх паслуг сельскаму насельніцтву

26 жніўня 2019 года ў Нацыянальным прэс-цэнтры Рэспублікі Беларусь адбылася прэс-канферэнцыя: «Актуальныя пытанні паляпшэння якасці жыцця ў вёсцы. Аб рэалізацыі сумеснага праекта РУП «Белпошта» і ААТ «АСБ Беларусбанк» па прадастаўленні банкаўскіх паслуг сельскаму насельніцтву ».

У мерапрыемстве прынялі ўдзел намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Алена Баркоўская, начальнік аддзела паштовай сувязі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Святлана Шыманская, начальнік упраўлення бухгалтарскага ўліку і фінансавага кантролю РУП «Белпошта» Вольга Кравец, начальнік тэхналагічнага забеспячэння, эксплуатацыі і паштовай бяспекі РУП «Белпошта» Алена Драздовіч, намеснік Старшыні Праўлення ААТ «АСБ Беларусбанк» Святлана Кажэкіна.

Праект па прадастаўленні банкаўскіх паслуг жыхарам сельскай мясцовасці ў аддзяленнях паштовай сувязі рэалізуецца ААТ «АСБ Беларусбанк» і РУП «Белпошта» са студзеня 2019 года. Мэта сумеснага праекта - набліжэнне і даступнасць банкаўскіх паслуг насельніцтву, якое пражывае ў сельскіх населеных пунктах, дзе адсутнічае ўстанова банка.

Па словах Святланы Генадзьеўны Кажэкінай, для Беларусбанка гэта магчымасць пашырыць геаграфію прысутнасці і прадастаўляць паслугі банка на аснове апошніх інавацыйных распрацовак.

Намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Алена Баркоўская звярнула ўвагу, што пошта валодае унікальнай інфраструктурай, якая ахоплівае ўсю тэрыторыю краіны, што дазваляе наблізіць як паштовыя, так і фінансавыя і іншыя сацыяльна значныя паслугі да кожнага спажыўца. Пры гэтым РУП «Белпошта» не ставіць сваёй мэтай замяніць банкі ў вёсцы. Акрамя таго, Алена Эдуардаўна адзначыла, што РУП «Белпошта» заўсёды гатова да новых эканамічна эфектыўных для прадпрыемства прапаноў і супрацоўніцтва і з іншымі юрыдычнымі асобамі.

У перспектыве Беларусбанк разлічвае на пашырэнне супрацоўніцтва з РУП «Белпошта» па прадастаўленні фінансавых паслуг. У цяперашні час сумесна праводзіцца работа па арганізацыі ў АСС паслугі па афармленні пакета дакументаў для адкрыцця рахунку і выдачы банкаўскіх плацежных картак міжнароднай плацёжнай сістэмы MasterCard.

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/26-08-2019-5181*